паратэатральных з'яў і якому ўласцівы рысы мастацкага прымітыву, з'яўляецца пахавальны культ, ці "pompa funedris".

Паратэатральнае дзейства як форма праяўлення прымітыву з'яўляецца кампанентам розных відаў і жанраў мастацтва і на прафесійным, і народным узроўнях. Яму ўласціва і стварэнне сваёй, асаблівай культуры. Яно з'явілася неад'емнай часткай "наіўнага" слоя "сарматцка-шляхецкай" культуры і "атрымала найбольш яркае ўвасабленне ў творах, ідэях, каштоўнасцях і традыцыях "сармацкага" барока (4, с. 98).


1. *Бахтин М.М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса. — М., 1965.

2. *Дадиомова О.В.* Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке / Минский институт культуры. — М., 1992.

3. *Тананаева Л.И.* Сарматский портрет: из истории польского портрета эпохи барокко / Акад. наук СССР. ВНИИ искусствознания Министерства культуры СССР. — М., 1979.

4. *Барышев Г.И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Союз театральных деятелей Республики Беларусь. — Мн., 1992.

5. *Дыярыюш* князя Міхала Казімера Радзівіла / Прадмова В.Арэшкі // Спадчына. — 1994. — № 4. — С. 18—47.

6. *Дризен Н.В.* К истории крепостного театра: Шкловский балет // Столица и усадьба. — 1914. — № 12—13.

7. *Wilinski S. U* zrodel portretu staropolskiego. — Warszawa, 1958. — S. 7.

8. *Мальдзіс А.І.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы беларускага быту і звычаяў. — Мн., 1982.



**І.Б.Вышынская,**
*аспірантка*


## РОЛЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА АСЯРОДДЗЯ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ Ў ПРАЦЭСЕ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ АСОБЫ СТУДЭНТА

У апошняе дзесяцігоддзе сацыяльна-эканамічны стан нашай краіны не мог не адбіцца на такіх сацыяльных інстытутах, як сям'я і школа. Зараз многія спецыялісты кажуць аб крызісе ў сістэме выхавання і адукацыі: ломка старых ідэалаў, маральных і духоўных установак, нараджэнне новых. Некаторыя асноўныя інстытуты сацыялізацыі асобы не паспяваюць выраштаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемы, "якія ўзнікаюць у працэсе выхавання, фарміравання індывіда". Не абмінулі гэтыя праблемы і сістэму адукацыі, якая з'яўляецца адным з вядучых фактараў сацыялізацыі асобы.

Сёння тэндэнцыі да змянення асноў светапогляду звязаны з распадам тэхнагеннай культуры. Яны не маглі не адбіцца на ўсёй сістэме выхавання і адукацыі. У новых сацыяльных умовах складаецца новая канцэпцыя выхавання, адной з метадалагічных асноў якой з'яўляецца прынцып гуманізацыі адукацыі, сэнс якога ў тым, што выхаванне павінна мець культуралагічны і антрапалагічны змест.

Працэс сацыялізацыі — гэта бесперапынны працэс засваення культуры; адукацыя, выхаванне — гэта не што іншае, як авалоданне культурай, працэс перадачы яе ад аднаго пакалення да другога. І ў гэтым працэсе важную ролю іграе сацыяльнае асяроддзе чалавека. "Сацыяльнае асяроддзе — гэта ўсё тое, што акружае чалавека ў яго сацыяльным жыцці, служыць аб'ектам яго псіхічнага адлюстравання — ці непасрэднага, ці апасродкаванага вынікамі працы іншых людзей. Уздзеянне сукупнасці сацыяльных фактараў чалавек адчувае на працягу ўсяго свайго жыцця. Усе яны, разам узятыя, складаюць сацыяльнае асяроддзе чалавека" (1). Сацыяльнае асяроддзе ўяўляе складаную, шматгранную сістэму, яна ўключае ў сябе і культурнае асяроддзе. Яно падразумявае сацыяльна-культурныя аб'екты, якія з'яўляюцца носьбітамі культуры і ў якіх узнаўляюцца і распаўсюджваюцца яго элементы. Пры аналізе сацыяльнага асяроддзя становіцца відавочнай сувязь паміж феноменам культуры і працэсам сацыялізацыі асобы. Калі разглядаць сацыялізацыю як "засваенне сацыякультурнага вопыту", то адна з асноўных задач гэтага працэсу — навучыць асобу ўспрымаць і разумець культуру. Засваенне культуры дапамагае зразумець развіццё не толькі асобы, але і ўсяго грамадства.

Культура ўяўляе сабой з'яву самаразвіцця на больш высокім узроўні культурнага развіцця, дзе кожны індывід набывае рысы цэласнай, гарманічна развітой асобы і магчымасць удасканальваць і развіваць сваю індывідуальнасць. Культура з'яўляецца мерай гуманізму грамадства, яго чалавечнасці, маральнай вышыні. Кожная навучальная ўстанова мае сваю індывідуальную культуру, традыцыі, асаблівасці. Таму можна гаварыць аб сацыякультурным асяроддзі навучальнай установы як аб адным з кампанентаў усяго сацыяльнага асяроддзя, у якім фарміруецца асоба, адбываецца яе сацыялізацыя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыякультурнае асяроддзе з'яўляецца ў сваю чаргу найважнешым фактарам духоўнага станаўлення і ўдасканальвання асобы, яе ідэалаў, інтарэсаў, патрабаванняў. Адна з асноўных функцый сацыякультурнага асяроддзя — гэта стварэнне і распаўсюджванне культурных каштоўнасцей, стварэнне духоўна-маральнай атмасферы. Сацыякультурнае асяроддзе вышэйшай навучальнай установы як магав лепш сваёй спецыфічнасцю адпавядае гэтым патрабаванням. "Місія вышэйшай навучальнай установы адметная, не параўнальная ні з чым: "ствараць" чалавека, рыхтаваць яго да жыцця, фарміраваць асобу высокай культуры" (2).

Аб уплыве сацыякультурнага асяроддзя на асобу сведчаць спосабы сацыяльных паводзін, дзейнасці, зносін індывідуума, яго адаптаванасці да змен сацыяльных умоў, а таксама праяўленне яго маральных арыентацый.

Нельга гаварыць аб важнасці сацыякультурнага асяроддзя вышэйшай навучальнай установы ў працэсе сацыялізацыі асобы студэнта, не падкрэсліваючы асаблівасцей студэнцкага ўзросту.

Субкультура студэнцтва як культура асобай сацыяльнай групы ўваходзіць у сацыякультурнае асяроддзе навучальнай установы, уносячы ў яе тым самым свае асаблівасці. Студэнцтва складае асобую групу, якая папаўняе рады інтэлігенцыі. Асоба студэнта — гэта асоба маладога чалавека, які рыхтуецца да высокакваліфікаванага выканання функцый спецыяліста ў той ці іншай галіне працоўнай дзейнасці. У ходзе навучання ў студэнта павінны быць сфарміраваны неабходныя для гэтага якасці, веды, уменні, навыкі, адпаведныя запытам грамадства. Але выкананне гэтых патрабаванняў на практыцы не заўсёды адпавядае рэаліям дня.

Калі падысці да вывучэння студэнта як асобы, то ўзрост 18—20 гадоў — гэта перыяд найбольш актыўнага развіцця маральных і эстэтычных пачуццяў, станаўлення і стабілізацыі характару і, што асабліва важна, авалодвання поўным комплексам сацыяльных роляў сталага чалавека: грамадзянскіх, грамадска-палітычных, прафесійна-працоўных і інш. Пераўтварэнне матывацый, усёй сістэмы каштоўнасных арыентацый, з аднаго боку, інтэнсіўнае фарміраванне спецыяльных здольнасцей у сувязі з прафесіяналізацыяй, з другога, вылучаюць гэты ўзрост у якасці галоўнага ў станаўленні характару і інтэлекту (3). Адсюль вынікае залежнасць сацыялізацыі асобы студэнта ад сацыякультурнага асяроддзя навучальнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

установы як асяроддзя, найбольш блізкага студэнту ў гады навучання. Знаходжанне ў ВНУ павінна аказваць развіваючы ўплыў на студэнта, гэта значыць забяспечыць працэс станоўчага яго змянення, набыцця якасцей, вопыту, патрэбных яму як будучаму спецыялісту, садзейнічаць у найбольшай ступені яго сацыялізацыі ў грамадстве. І ў гэтым ключы ВНУ павінна ўлічваць асноўныя сучасныя тэндэнцыі развіцця грамадства, яго запыты і патрабаванні. Гэта не можа не адлюстравацца ў мадэлі спецыяліс-та, на якую арыентуецца ВНУ пры падрыхтоўцы студэнта.

Ва ўмовах перабудовы сучаснай адукацыі мяняецца ідэал адукаванага чалавека, побач з традыцыйнымі поглядамі складваюцца новыя ўяўленні аб чалавеку і яго адукаванасці. Адбываецца змена антрапалагічных асноў педагогікі. Сёння адукаваны чалавек — гэта не толькі “чалавек, які ведае”, нават са сфарміраваным светапоглядам, але і падрыхтаваны да жыцця, які арыентуецца ў складаных праблемах сучаснай культуры, здольны асэнсаваць сваё месца ў свеце. Гэтыя тэндэнцыі ўжо знайшлі адлюстраванне ў мадэлі сучаснага спецыяліста, якая грунтуецца на такіх асноўных кампанентах, як светапогляд, агульная культура, інтэлігентнасць, прафесійныя веды і асабістыя якасці. У фарміраванні гэтага вялікую ролю адыгрываюць сацыяльна-гуманітарныя навукі, якія могуць выступаць як каштоўнасныя арыентацыі для студэнтаў. Адсюль сувязь паміж сацыялізацыяй студэнта, зместам адукацыі ў ВНУ, стандартамі адукацыі, якія ўваходзяць у сацыякультурнае асяроддзе вышэйшай навучальнай установы і аказваюць непасрэдны ўплыў на фарміраванне індывіда.

Нельга не адзначыць такі важны элемент сацыякультурнага асяроддзя ВНУ, як сфера педагагічных зносін “выкладчык — студэнт”. Асабісты ўплыў выкладчыка на студэнта ў працэсе педагагічных і нефармальных зносін, духоўнае ўздзеянне на маладога чалавека ўсёй жыццядзейнасцю калектыву навучальнай установы і асабліва студэнцкай групы выконваюць адну з галоўных роляў у станаўленні і фарміраванні будучага спецыяліста.

Зараз у сферы адукацыі склаліся праблемныя абставіны, якія не могуць не адбіцца на сацыякультурным асяроддзі вышэйшай навучальнай установы, што выклікана, у першую чаргу, неадпаведнасцю паміж змястоўнымі кампанентамі навучальнага працэсу і патрабаваннямі грамадскага развіцця, паміж мэтамі адукацыі і яго вынікамі. “З’явілася тэндэнцыя дэвальвацыі ведаў і дыплома ВНУ, выразна праглядваецца прагматычны падыход



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да адукацыі, недаацэньваецца агульнакультурная падрыхтоўка, што тоіць у сабе пэўную пагрозу развіццю асобы" (4).

Але, як адзначалася раней, адукацыя шмат у чым залежыць ад сацыяльна-эканамічнага стану грамадства. "Але і сацыякультурныя фактары таксама складаюць яго важнейшую дэтэрмінанту. Менавіта адукацыя можа ў той ці іншай ступені ўцягваць у сваю арбіту непасрэдна ці ўскосна ўсе класы і сацыяльныя групы, аказваць істотны ўплыў на ўсе бакі духоўнага жыцця" (5).

Улічваючы вышэйсказанае, можна адзначыць, што найбольш эфектыўным сродкам рашэння праблемы фарміравання асобы спецыяліста ў сучаснай вышэйшай школе з'яўляецца стварэнне тут сапраўды сацыякультурнага асяроддзя, у змест якога ўваходзяць: усялякае задавальненне патрабаванняў асобы ў ведах; фарміраванне ў студэнтаў навыкаў самастойнага пошуку інфармацыі; развіццё незалежнага творчага мыслення індывіда; стварэнне ўмоў для развіцця інтэлектуальнага, культурнага чалавека; фарміраванне сапраўднага прафесіяналізму і стварэнне ўмоў для навуковага пошуку; арыентацыя на агульначалавечыя маральныя каштоўнасці (4).

Таму, на нашу думку, увесь навучальны працэс павінен быць адаптаваны да сучасных сацыяльна-эканамічных умоў, а таксама спрагназіраваны ў будучыню. Сістэма яго павінна быць мабільнай і самаразвіццёвай, што ўключае перагляд усіх асноўных педагагічных характарыстык: мэты, стандартаў, зместу навучання, уплыву на сацыялізацыю асобы студэнта, на поўную адаптацыю яго ў грамадстве. Толькі ў гэтым выпадку сацыякультурнае асяроддзе ВНУ будзе здольна аптымальна выконваць сваю ролю ў працэсе станаўлення асобы студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Сычев Ю.В.* Микросреды и личность. Философские и социологические аспекты. — М., 1974. — С. 8.

2. *Зубра А.С.* Вядучая мэта вышэйшай адукацыі — фарміраванне культуры асобы // Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 5.

3. *Ананьев Б.Г.* К психофизиологии студенческого возраста // Современные психолого-педагогические проблемы высшей школы. — Л., 1974. — С. 5—8.

4. *Горбатенкова Л.М.* Влияние социокультурных условий на учебную деятельность студентов // Адукацыя і выхаванне. — 1998. — № 8. — С. 25.

5. *Ерасов Б.С.* Социальная культурология. — М., 1996. — С. 324.